**Мацieўскi, М.** Той бой незабыўны / М. Мацieўскi // Сцяг Ільіча (Талачын). — 2000. — 16 снеж. — С. 2.

## ТОЙ БОЙ НЕЗАБЫЎНЫ

Яны адыходзілі з гор, так і не выявіўшы банду душманаў, у якой, па разведданых, была рэактыўная ўстаноўка, каля 12 ручных кулямётаў і іншае ўзбраенне. Пэўна ў камандавання ўзніклі іншыя думкі наконт далейшых дзеянняў іх падраздзялення, бо паступіла каманда адысці.

Ужо недалёка былі баявыя машыны дэсантнікаў, калі раптам з-за дувалаў па байцах ударылі аўтаматныя чэргі. Уласна, гэта не было нечаканасцю, бо, калі яны яшчэ падымаліся ў горы, з-за глінабітных руін убаку ад сцежкі чуліся рэдкія стрэлы. Але ж камандаванне думала, што душманаў там мала, і не звярнула на іх асаблівай увагі. Відавочна, за той час, пакуль падраздзяленне хадзіла ў горы, да душманаў прыбыло падмацаванне, і яны наладзілі засаду.

Камандзір узвода лейтэнант Ільін аказаўся побач з Сяргеем, з другога боку з-за ўкрыцця страляў з аўтамата баец, якога яны называлі «сапёрам», далей занялі баявыя пазіцыі астатнія воіны. А душманы – вось яны, побач. І яшчэ далей, злева і справа, мільгаюць фігуры ў чорным, барадатыя, з нянавісцю ў вачах, рыхтуючыся акружыць жменьку нашых байцоў, захапіць іх і тады… Што будзе тады, Сяргей стараўся не думаць, бо ведаў пра людаедскую жорсткасць душманаў. Ды і не да таго яму. Трэба было па магчымасці больш знішчыць душманаў і самому застацца жывым. І ён націскаў і націскаў на курок аўтамата, бо патронаў хапала. А затым, калі душманы падкраліся зусім блізка, імкнучыся акружыць байцоў, кінуў у іх адну гранату, другую, трэцюю… Апошнюю, чацвёртую, гранату некалькі секунд патрымаў у руках, вагаючыся ў думках, але затым кінуў і яе. Загрымелі разрывы гранат іншых байцоў. Душманы адкаціліся.

Сяргей азірнуўся. Стагнаў адзін з байцоў злева. З яго калена лілася кроў. Яны кінуліся з лейтэнантам да збялелага байца, хуценька перавязалі рану. Яна аказалася неглыбокай, проста сарвала з калена скуру.

– Не дрыжы ты так, – прыкрыкнуў на байца Сяргей. – Драпіны на назе спалохаўся…

А душманы ўжо нахабна лезлі зноў, ударылі з флангаў кулямёты. Пэўна, да іх падышло новае падмацаванне.

– Адыходзім! – крыкнуў лейтэнант Ільін байцам. Сяргей рынуўся ўслед за іншымі, паварочваючыся час ад часу і пасылаючы чаргу за чаргой у душманаў. І раптам у грудзі ўдарыла, нібы чымсьці цяжкім-цяжкім, зазвінела ў галаве. Але ён дабег яшчэ да сваіх, убачыў, як неслі байцы параненага ў жывот байца таджыка Марынава.

Ужо ў шпіталі Сяргею сказаў хірург, які рабіў аперацыю: «Ну, шчаслівы ты, хлопец, калі б некалькі сантыметраў бліжэй пацэліў душман – куля трапіла б у сэрца»…

– Тады з нашага ўзвода ніводзін баец не застаўся не параненым, – прыгадвае той далёкі бой з душманамі Сяргей Ляўша. – Усе байцы былі адзначаны ўрадавымі ўзнагародамі, ордэнамі Чырвонай Зоркі, у тым ліку я і лейтэнант Ільін.

Ордэн воіну Сяргею Ляўшу быў уручаны 12 чэрвеня 1984 года ў Кабуле. Урачыста гучаў перад застыўшым строем голас камандзіра палка, які зачытваў Указ: «За мужнасць і адвагу, праяўленыя пры выкананні інтэрнацыянальнага абавязку ў Афганістане…»

Праз чатыры дні Сяргей Ляўша разам з іншымі звольненымі ў запас воінамі вылецеў з Кабула на радзіму.

А яшчэ праз некалькі дзён ён абдымаў у пасёлку Усвіж-Бук заплаканую маці Наталлю Васільеўну.

– Ад радасці, сынок, плачу, ад радасці, што жывы, здаровы, – сказала яна, выціраючы краем хусцінкі вільготныя вочы. І ўздыхнула: «Шкада, бацька не бачыць, які ты ў нас стройны ды ладны…».

Колькі начэй яна не даспала, чакаючы вестачкі ад сына-воіна. Чула, як лютуюць у Афганістане душманы, і перажывала, вельмі перажывала за сваё дзіця. А Сяргею не заўсёды выходзіла напісаць маці. Прадукты харчавання, пісьмы ім дастаўлялі ў воінскую часць на верталётах. Нярэдка ішлі на баявыя заданні ў горы на некалькі дзён. Дзе ўжо там пісаць пісьмы!..

– А душманаў тады ўсё ж разбілі, – усміхаецца Сяргей. – Тых, што наладзілі нам засаду. Ушчэнт раскалашмацілі нашы верталётчыкі. І вандруючую рэактыўную ўстаноўку разам з абслуговым персаналам выявілі і паразілі бомбавымі ўдарамі.

…На торфабрыкетным заводзе «Усвіж-Бук» – абедзенны перапынак. Мы сядзім з Сяргеем Мікалаевічам у бытавым пакоі мехцэха, і нетаропка цячэ наша гаворка, і прыгадваюцца былому воіну-інтэрнацыяналісту адзін за адным баявыя эпізоды там, на зямлі Афганістана, за якую ён праліваў сваю кроў.

**М. Мацieўскі**